# Паміж Цной і Камароўкай

Інфармацыйны бюлетэнь кааліцыйных дэмакратычных сіл Савецкага раёна • № 6 (1) • травень 2007


## У цэнтры Менску плануюць знішчыць унікальныя помнікі архітэктуры 17-ага стагоддзя.

**Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Беларусі нядаўна ўхваліла перадпраектную прапанову па рэканструкцыі і прыстасаванні будынкаў былога манастыра бернардынцаў у Менску. Помнікі архітэктуры 17-га стагоддзя знаходзяцца на тэрыторыі верхняга горада па вуліцы Кірылы і Мяфодзія, блізка да плошчы Свабоды. Паводле дакументаў, якія патрапілі ў рэдакцыю газэты “Наша Ніва”, мэр Менску зацвердзіў план рэканструкцыі комплекса. Унікальную гістарычную спадчыну спраектавана перарабіць у гатэльны комплекс з рэстаранамі, падземным паркінгам ды басейнам.**



Тым часам ані пра якае культурна-асьветнае прызначэньне помнікаў, ані пра іх вяртаньне забранага яшчэ ў 1863 г. законным уласьнікам — каталіцкай царкве — гаворка не вядзецца. Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада прапанавала завяршыць навукова-даследчыя працы, дапрацаваць аўтару праекту прадпрыемству “Мінскпроектрэстаўрацыя” праект, каб пазней абмеркаваць зменены варыянт.

Яшчэ ў 1920-1930-я гады цэнтр Менска ўяўляў сабою цэласнае гісторыка-градабудаўнічае ўтварэнне - спадчыну розных эпох, хоць і тады знішчаліся каштоўныя грамадскія будынкі. За камуністычнымі часамі знішчылі большасць вартасных архітэктурных помнікаў. З вялікай колькасці культавых пабудоў, што існавалі ў канцы XVIII-пачатку XX стагоддзяў, да нашага часу захаваліся толькі адзінкі. Знеслі дамініканскі кляштар з касцёлам, узарвалі царкву Святога Духа. Назаўсёды страчаныя кляштар бенедыктінак з касцёлам, кармеліцкі, баніфратарскі, францысканскі кляштары, жаночы Траецкі манастыр, ды іншае. У 1984 годзе ўзарвалі будынак былога гарадскога тэатра, які меў вялікую гістарычную каштоўнасць і будаваўся на працягу XVIII, XIX і XX стагоддзяў. У 1985 адбылося злачыннае канчатковае вынішчэнне гістарычнага менскага замчышча па рашэнні партыйных уладаў з дапамогай маскоўскіх «спецыялістаў», прыкрытае «патрэбамі» будаўніцтва метрапалітэна.

Менск стаў адзінай сталіцай у Эўропе, дзе бясследна зруйнаваны гістарычны цэнтр. Цяперашні Менск ужо мала цікавы для замежнікаў з турыстычнага гледзішча. Тым часам нашыя блізкія суседзі рупліва ставяцца да сваёй гістарычнай спадчыны. Гістарычныя часткі Вільнюсу, Рыгі, Варшавы, Львову занесены ЮНЭСКА ў спіс сусветнай спадчыны.

Нішчанне (мэтанакіраванае?) беларускай спадчыны адбываецца й за часамі Лукашэнкі. Адкрыты ліст гісторыкаў аб неабходнасьці спынення гвалтоўнага разбурэння гістарычнага цэнтра Менска адзначыў, што на тэрыторыі гістарычнага цэнтра, не зважаючы на прынятыя, у тым ліку і раней, дакументы аб яго рэканструкцыі, у парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь і нарматыўных актаў, якія рэгламентуюць горадабудаўнічую дзейнасць, вядзецца актыўнае размяшчэнне і будаўніцтва буйных гандлёвых комплексаў, офісных збудаванняў і іншых новых аб’ектаў камерцыйных арганізацый. Напрыклад, у адпаведнасці з выдадзенымі ўпраўленнем па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры ўзгадненнямі, у дадатак да ўжо знішчанага ў канцы 2003 г. гістарычнага будынка па адрасе пл.Свабоды,15, у 2004 г. быў знесены цэлы комплекс будынкаў на вул. Рэвалюцыйная 6Б, 12В, 12Г- захаванай да сённяшняга дня гістарычнай забудовы, якая перажыла ўсе войны і акупацыі, і нават пры наяўнасці падпісаных ахоўных абавязацельстваў (!) мела няшчасце патрапіць пад пляму размяшчэння на гэтым месцы камерцыйнага аб’екта, ў выніку чаго была знішчана. Размяшчэнне на гэтым месцы рыначнага комплексу камароўскага тыпу парушае ўсю дзеную нарматыўна-прававую базу Рэспублікі Беларусь.

Менскія архітэктары і на гэты раз звярнуліся ў дзяржаўныя ўстановы з адкрытым лістом, у якім называюць памылковым рашэньне Міністэрства культуры датычна праекту прыстасавання менскага кляштару бэрнардзінаў пад гатэльны комплекс. Але вопыт паказвае, што звароты кампетэнтных арганізацыяў і спецыялістаў, вынікі грамадзкіх ініцыятываў з тысячамі подпісаў мала што значаць для ўлады, якая працягвае пазбаўляць нас нашай высокакаштоўнай спадчыны.

Заклікаем усіх неабыякавых да роднай культуры й гістарычнай спадчыны Беларусі сачыць за развіццем падзеяў вакол будынкаў манастыра, як мага шырэй асвятляць і распаўсюджваць інфармацыю пра сітуацыю з былым кляштаром. Верагодня, толькі масавыя акцыі абароны святыні дапамогуць захаваць яе для наступных пакаленняў.

**Гудовіч Андрэй**

## Калі будуць толькі адмененыя льготы бяз рынкавых рэформаў, то гэта глупства, мяркуе эксперт.

**Калі будуць толькі адмененыя льготы бяз рынкавых рэформаў, то гэта глупства, сказаў у інтэрвію радыё “Свабода” былі міністар працы Аляксандар Сасноў. На ягоную думку, скасаванне ільготаў можа ў прынцыпе добра паўплываць на эканоміку краіны. У прыватнасці, на камунальную гаспадарку, бо з прыйсцем туды прыватнага капіталу, зьявіцца канкурэнцыя, а значыць паменшаюць выдаткі. Але вітаць адмену льготаў можна толькі ў выпадку правядзення адпаведных рынкавых рэформаў, чаго ўлады рабіць не збіраюцца. Такім чынам, дзяржава проста скідае з сябе цяжар сацыяльнай падтрымкі людзей, а нярынкавая эканамічная сістэма астаецца нязменнай.**

Дзейны ражым увесь час трубіць пра тое, што ў Беларусі праводзіцца палітычны курс на сацыяльна арыентаваную дзяржаву, што сацыяльная абарона насельніцтва — асноўнае адрозненне беларускай мадэлі развіцця ад іншых суседніх краінаў, якія пайшлі шляхам рынкавых рэформаў. Прычым, у сваіх апошніх выступах Лукашэнка казаў, што ніякіх асаблівых новых выклікаў для Беларусі ён ня бачыць, меняць палітыку не зьбіраецца. Цяпер жа выканаўчая ўлада ініцыявала законапраект аб скасаванні большасьці льготаў.

Гэта сведчыць на надыход сур’ёзнага сацыяльна-эканамічнага крызісу. Эканоміка губляе канкурэнтаздольнасьць, паменшаюць паступленьні ў бюджэт. Павялічваецца напружаньне ў фінансавай сфэры.

Намесьніца кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта Н. Пяткевіч і ўвогуле сказала ў Палаце прадстаўнікоў, што трэба было б увогуле адмяніць усе льготы. “Але вырашылі пайсці паступова й захаваць ільготы, змяніўшы да іх падыход”, — сказала яна. “Не ад вялікіх грошай ды не ад добрага жыцця эканоміць дзяржава. Сёння трэба падтрымаць насельніцтва ў сувязі з павялічэннем цэнаў на энэрганосьбіты. Можна захаваць ільготы, але мы адпаведна атрымаем у тры-чатыры разы большыя жыроўкі”, - дадала Пяткевіч.

Ільготы, якія засталіся ад савецкага часу, сапраўды трэба перагледзець, але з удзелам грамадзкасці і зацікаўленых няўрадавых арганізацый. Дый у межах цяперашняй сістэмы і шточаснага падзення ўзроўню жыцця шмат людзей без ільготаў існаваць ня зможа.

Але на прапанову прадстаўнікоў грамадзкіх арганізацый вынесці законапраект на ўсенароднае абмеркаванне, Н. Пяткевіч адказала: “Праект закону на ўсенароднае абмеркаванне выносіцца ня будзе”. Сустрэчай у ніжняй палаце парламенту з дэпутатамі і намеснікам старшыні Адміністрацыі прэзідэнта прадстаўнікі грамадзкіх арганізацый асталіся недавольныя. Намесніца беларускага грамадзкага аб’яднання “Аўтограф Чарнобыля” Л. Нагорная сказала: “Мы прыйшлі, каб абмяркоўваць гэты праект, а па завершанні збораў зразумелі, што абмяркоўваць няма чаго, бо ўсе ўжо даўно вырашана”.

Дэпутаты плануюць разгледзець законапраект пра льготы на плянарным паседжанні ў канцы траўня.

**Гудовіч Андрэй**


Мы ў Інтэрнэце:
гарачая лінія
+375299029516
# Форум
# Навіны
# Абмеркаванне артыкулаў
# Вашыя пытанні, падзякі

Дасылайце вашыя артыкулы на
kamarouka@gmail.com
і мы іх надрукуем

www.kamarouka.org



+375299029516
далучайся
kamarouka@gmail.com


## Фонтан на праздник приглашает…

**Фонтан в Александровском сквере. Фото БЕЛТА Праздник фонтанов по традиции планируется провести 9 мая. В этом году горожан ждет сюрприз - в столице начнут работать пять новых фонтанов**

Сейчас водометы (так фонтаны называли в старину) готовят к новому сезону - проверяют, обновляют, ремонтируют, благоустраивают прилегающую территорию. В отделе городского хозяйства Мингорисполкома сообщили, что один из новых фонтанов построен на площади Независимости. Это будет первый в столице светомузыкальный фонтан. Неподалеку от гостиницы «Минск», за зданием Комитета архитектуры и градостроительства Мингорисполкома, также заработает водомет после реконструкции. Новый фонтан построен и в Парке имени Челюскинцев. Но его пока не передали на баланс городским службам, поэтому он начнет работать чуть позже. Еще два водомета будут радовать минчан и гостей города на проспекте Независимости возле торгового центра «Счастье» и на улице Мельникайте у Национального центра красоты.

По данным отдела городского хозяйства в столице насчитывается 55 фонтанов. Из них около 20 находятся на балансе Минскзеленстроя, остальные - в ведении других предприятий и организаций города.